Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
29 САКАВІКА 2017 г. СЕРАДА № 59 (28423)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Ці варта выходзіць з аўдыторыі на ЦТ?

СТАР. 3



Што паказаў мабільны маніторынг?



Каб не цягнуць да апошняга

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ, старшыня Магілёўскага аблвыканкама:**

*«У Беларусі неабходна распрацаваць праграму раўнамернага развіцця рэгіёнаў: у краіне пакуль няма адзінай палітыкі і канцэпцыі перспектыўнага развіцця рэгіёнаў. З-за гэтага адбываецца дысбаланс у фінансаванні і развіцці асобных тэрыторый. Таму патрэбен збалансаваны падыход па размеркаванні бюджэтных рэсурсаў, дакладная расстаноўка прыярытэтных кірункаў і тэрыторый развіцця, пераход да больш актыўнай рэгіянальнай палітыкі. Аддаленая ад сталіцы тэрыторыі павінны атрымаць больш падтрымкі і прэферэнцый у мэтах далейшага ўстойлівага развіцця. Толькі так мы зможам прыцягнуць сюды інвестараў і бізнес, ствараць новыя працоўныя месцы, развіваць сацыяльную сферу і павышаць узровень жыцця насельніцтва».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8748 | ▲ |
| Еўра | 2,0347 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0690 | ■ |

ISSN 1990 - 763X

# СВІСЛАЧ АЛІМПІЙСКАЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Навучэнкі Мінскай школы алімпійскага рэзерву трэніруюцца на рацэ Свіслач у сталічным мікраараёне Серабранка.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## Каб добраўпарадкаванне да пажару не давяло

### Сёлета ад выпальвання травы ўжо ёсць пацярпелыя

**Кожную вясну ратавальнікі сутыкаюцца адначасова з дзвюма праблемамі, якія, на першы погляд, супярэчаць адна адной. Гэта паводкі і пажары ў экасістэмах. Увесну ў зводкі здарэнняў трапляюць не столькі лясныя або тарфяныя пажары, колькі ўзгаранні травы і кустоўя. Часцей за ўсё даводзіцца тушыць мінулагоднюю расліннасць, якую гаспадары прысядзібных участкаў не палічылі патрэбным прыбраць яшчэ ўвосень.**



Чамусьці людзі прытрымліваюцца меркавання, што травяны пажар — гэта працэс, які скончыцца сам па сабе і ніякай шкоды не прыносіць. Але з экалагічнага боку выпальванне сухой травы нічога карыснага не нясе. У верхніх слаях глебы жыве шмат вельмі дробных насякомых, жывёл і чарвякоў, якія прыносяць шмат карысці экасістэмам. У агні ж яны ўсе гінуць. І глеба імгненна збядняецца.

— Сёлета ратавальнікам вельмі моцна дапамагае надвор'е, — кажа памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь Навіцкі. — Напрыклад, у 2015-м, калі пачатак вясны выдаўся вельмі сухім, быў дзень, калі з-за выпальвання травы загінулі адразу пяць чалавек. Сёлетні ж сакавік пакуль выдаўся даволі шчодрым на ападкі і скупым на яснае сонечнае надвор'е. Дзякуючы гэтаму ў зямлі захоўваецца вельмі шмат вільгаці, ды і расліннасць таксама не гарыць. Але, на жаль, не заўсёды. Па стане на раніцу панядзелка, з пачатку года ў краіне ўжо зарэгістравана 116 выпадкаў пажараў травы і кустоўя. Некантраляваны агонь прынёс шкоду на 33 гектарах зямлі. Што да рэгіёнаў, то ў сумныя «чэмпіёны» выбіліся Магілёўская вобласць і Мінск. Не ў апошнюю чаргу з-за таго, што моцных дажджоў тут было значна менш.

СТАР. 4

■ Жыллё

## Сістэма адрасных субсідый дойдзе да кожнага чаргавіка

**А ўвогуле новы механізм крэдытавання дазволіць павялічыць аб'ём будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай у нашай краіне больш чым удвая, паведаміў першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр КРУЧАНАЎ у час работы выстаўкі «Беларускі будаўнічы тыдзень — 2017».**

У прыватнасці, ён паведаміў, што ў пастанове ўрада №1113, якая вызначае аб'ёмы будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, закладзена ўзвесці 375 тысяч квадратных метраў жылых памяшканняў. Цяпер у міністэрстве плануюць, што з улікам прыцягнення крэдытаў камерцыйных банкаў магчыма выйсці на ўзвядзенне ўжо 840 тысяч «квадратаў». Сёння для гэтага неабходна інвеставаць у будаўніцтва 185 млн рублёў.

Першы намеснік міністра адзначыў, што Беларусбанк адшукаў частку неабходных сродкаў у аб'ёме каля 100 млн рублёў. З іх 50 млн рублёў пайшло на напаўільготнае крэдытаванне, якое карыстаецца попытам у грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. «Астатнія банкі прыглядаюцца. Усё ж такі гэта навіна, нарматыўна-прававая база толькі ствараецца», — сказаў Аляксандр Кручанаў. Пры гэтым ён выказаў упэўненасць, што вопыт Беларусбанка і Белаграпрамбанка надасць упэўненасці іншым банкаўскім установам для далучэння да працэсу. Падобныя крэдыты на жыллё з'яўляюцца зваротнымі і найменш праблемнымі.

Таксама ён дадаў, што праект указа, якім вызначаецца дадатковы механізм крэдытавання жылля з дзяржпадтрымкай, цяпер знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе. «У найбліжэйшы час ён будзе накіраваны кіраўніку краіны», — адзначыў Кручанаў.

Нагадаю, што, паводле новага механізма дзяржпадтрымкі, грамадзянін зможа атрымаць субсідыю, а потым накіруе яе на пагашэнне крэдыту, які атрымае на камерцыйных умовах. Сістэма стане працаваць так: камерцыйныя банкі прапануюць крэдытаатрымальнікам пазыковыя сродкі пад будаўніцтва жылля, а грамадзяніну будзе налічвацца субсідыя. Для некаторых катэгорый яна пойдзе на пагашэнне часткі працэнтаў і часткі асноўнага доўгу на крэдыт. Гэта дазволіць, па-першае, прыцягваць у будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай дадатковыя рэсурсы, якія ёсць у камерцыйных банкаў. Па-другое, пазбягаць дырэктыўнага крэдытавання, калі магчыма будзе адмовіцца ад прамога пералічэння банкам сродкаў з бюджэту.

Спецыялісты падлічылі, што працэнтныя стаўкі для слабаабароненых катэгорый у асноўным не зменяцца, а памеры субсідый будуць разлічвацца такім чынам, каб у грамадзян заставаліся прыкладна тыя ж аб'ёмы плацяжоў, што і раней пры льготным крэдытаванні. Пры гэтым будзе дзейнічаць і Указ №13 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення грамадзянам дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве (рэканструкцыі) або набыцці жылых памяшканняў».

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# БЛІЗКІЯ НАРОДЫ ЗАСТАНУЦЦА БЛІЗКІМІ

## Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Паслом Арменіі ў Беларусі

**Краіны маюць аднолькавую пазіцыю па ўсіх пытаннях міжнароднай павесткі дня, у нашай дзяржаве цалкам разумеюць тую палітыку, якую праводзіць кіраўніцтва Арменіі. На гэта зрабіў акцэнт беларускі лідар Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Арменіі ў нашай краіне Арменам Хачатранам.**

### Мы не чужыя

Сустрэча адбылася па прычыне завяршэння дыпламатычнай місіі спадара Пасла ў Беларусі — ён працуе ў нас з красавіка 2010 года.

— Чалавек, які верай і праўдай праслужыў адзінству беларускага і армянскага народаў на працягу сямі гадоў, — вы ведаеце, якое да яго можа быць стаўленне ў нас у Беларусі, асабліва ў мяне, — сказаў Прэзідэнт. — Мы заўсёды адчувалі вашу падтрымку... Мы ведалі, што вы — чалавек, які любіць Беларусь.

Абедзве краіны маюць агульнае савецкае мінулае, адпаведна, нас многае звязвае.

— Вы павінны ведаць, што армянскі народ для нас ніколі не быў чужым народам, — запэўніў беларускі лідар. — Мы як дзве дзяржавы займаем абсалютна аднолькавую пазіцыю па ўсіх пытаннях міжнароднага парадку дня. Мы цалкам разумеем тую палітыку, якую праводзяць цяперашняе кіраўніцтва Арменіі і былое кіраўніцтва.

### Людзі вартыя жыць годна

Прэзідэнт закрануў тэму Нагорнага Карабаха:

— Ёсць вострыя пытанні — у армян, у беларусаў. Дапусцім, Нагорны Карабах. Прама вам скажу, гэта не наша пытанне, гэта не мае пытанне. Нам там рабіць няма чаго. Ёсць бакі канфліктуючыя, якія павінны ў гэтым разабрацца. Але, калі ў мяне Прэзідэнт Арменіі або ў Арменіі пытаюць пра гэта, або ў Азербайджане — Прэзідэнт Азербайджана або азербайджанцы пра гэта пытаюць, — мая пазіцыя, дзе б я ні быў, адна. Людзі вартыя жыць годна. Далей я кажу — не веру, што сёння ў Нагорным Карабаху, у гэтым анклаве, людзі жывуць добра і годна. Якое гэта годна, калі ты кожны дзень адчуваеш, што табе на галаву нешта можа зваліцца і ў цябе жыццё можа скончыцца?

Таму, падкрэсліў Прэзідэнт, наша пазіцыя — адназначная.

— Арменія і Азербайджан без усялякіх пасрэднікаў (вось гэта маё асабістае меркаванне — не трэба гэтых пасрэднікаў — ні моцных, ні слабых) павінны сесці за стол і вырашыць праблему. Разумееце, яны павінны вырашыць праблему. Калі яны захочуць нейкага ў гаранты ўзяць, яны ўдваіх няхай вызначацца. Сёння ёсць такі момант, каб вырашыць гэтае пытанне. Але галоўнае — гэта людзі. Нельга ў палітыку разыгрываць гэту карту, калі гінуць людзі і гаруюць людзі. Гэта наша непахісная пазіцыя па ўсіх канфліктных кропках у свеце. Ці то Украіна, ці то Нагорны Карабах, Прыднястроўе і гэтак далей. Трэба, каб людзям было добра. Што добрага, калі там недзе ва Украіне то з аднаго боку, то з іншага пачынаюць бамбіць, і гінуць людзі? Пра што тут можна казаць? Хачу, каб вы, як наш блізкі сябра, ведалі маю пазіцыю. Але — гэта калі ў мяне пытаюць. Калі не пытаюць — гэта не мая справа.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: ён не любіць пасрэднікаў.

— Я ненавіджу пасрэднікаў, ненавіджу міратворцаў, таму што яны вакол Беларусі, колькі я Прэзідэнтам, столькі і ходзяць. То міратворцы, то пасрэднікі, то з Еўрасаюзам, то яшчэ з некім... Дык мы і без пасрэднікаў разбяромся — з Еўрасаюзам, з іншымі дзяржавамі і гэтак далей. Сёння ўжо пра Расію кажуць, што пасрэднікі там неабходны паміж Пуціным і Лукашэнкам. Супакойцеся! У нас з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным цудоўныя адносіны. Цудоўныя. Падбяром час, сустрэнемся, калі ёсць некаторыя праблемы, мы іх вырашым. Без пасрэднікаў мы вырашым удваіх, і нам не патрэбна ніякае пасрэдніцтва. Мы родныя браты, нам дзяліць няма чаго. Я яму неяк публічна сказаў — можа быць, будзе яшчэ час, калі прыйдзецца спінай да спіны стаць і адстрэльвацца, як у ваенных людзей кажуць.

### З хворай галавы на здаровую

Прэзідэнт выказаўся і наконт пытання, якое ўзнікла некалькі месяцаў таму і якому надалі вельмі шмат увагі сродкі масавай інфармацыі постсавецкай прасторы. Гэта арышт і экстрадыцыя блогера Аляксандра Лапшына, затрыманага ў Мінску ў снежні мінулага года па запыце Азербайджана:

— Памятаеце, Лапшын? Слухайце, пры чым тут Арменія? Ды Арменія мне пра Лапшына ніколі нічога не казала. Ён быў аб'яўлены ў вышук адной краінай — Азербайджанам. Калі яго тут затрымалі? я думаю: ну навошта яго тут затрымалі? Няхай бы ён ехаў куды заўгодна. Вось на сваю галаву праблемы, я шчыра кажу. Але затрымалі. Інтэрпол ведаў. Мы паведамілі як належыць, як законапаслухмяныя. Каму мы павінны былі яго перадаць? Таму, хто аб'явіў яго ў вышук. Больш за тое. Гэта я першы раз вось вам скажу і публічна — а яго і не хацеў ніхто забіраць. Гэта пасля ўжо пачалі разыгрываць гэту карту. Ён грамадзянін трох краін, ні адна з краін на яго не прэтэндавала. Не трэба! З хворай галавы на здаровую перакінуць — і ўсё. Таму ў любым пытанні ёсць пэўныя падтэксты, і гэтае пытанне будуць скланяць так, як некаму гэта выгадна.

Нагадаем, у Азербайджане Аляксандр Лапшын абвінавачваецца па артыкуле 281.2 (публічныя заклікі, накіраваныя супраць дзяржавы) і артыкуле 318.2 (незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы) Крымінальнага кодэкса. У красавіку 2011 года і кастрычніку 2012 года Лапшын ездзіў у Нагорны Карабах, большую частку гэтай тэрыторыі кантралюе непрызнаная Нагорна-Карабахская Рэспубліка. У той жа час Азербайджан па-ранейшаму лічыць Карабах сваёй тэрыторыяй, часова акупаванай войскамі Арменіі. Таму, каб легальна патрапіць у Карабах, трэба атрымаць афіцыйны дазвол азербайджанскіх улад. Лапшын гэтага не зрабіў, тым самым ён парушыў закон Азербайджана аб дзяржаўнай мяжы.

— Таму вы павінны ведаць самае галоўнае: што мы былі блізкімі народамі, мы такімі і застанёмся. Да Азербайджана Арменія адносіцца па-рознаму. Але гэта таксама наш блізкі народ, дзяржава, з якой мы былі ў адной краіне. Чаму мы павінны з Азербайджанам або з Арменіяй сварыцца? Можа мы Арменіі і Азербайджану некалі спатрэбімся? Не пасрэднікамі. Вось калі-небудзь спатрэбімся. Таму навошта мне лезці далёка туды, куды мяне не просяць? Гэта такая народная пазіцыя, сыходзячы з мудрасці беларускага народа, сыходзячы з мудрасці армянскага, — сказаў Прэзідэнт.

Армен Хачатран падзякаваў беларускаму лідару. Па словах дыпламата, нават складана перадаць удзячнасць за гады, якія ён працаваў у Беларусі. Ён прызнаўся, што Беларусь — найцудоўнейшая краіна, дзе жыве найцудоўнейшы народ.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ІМІДЖАВЫ ПРАЕКТ

**На днях кіраўнік краіны з афіцыйным візітам наведае Туркменістан. Там нашы спецыялісты заканчваюць будаўніцтва Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната. За гэты праект не рашаліся браца ў часы Савецкага Саюза.**

Візіт беларускага лідара ў гэтую цэнтральнаазіяцкую краіну пачнецца ўжо сёння, 29 сакавіка, і працягнецца да 31 сакавіка.

— Мы заканчваем велізарную будоўлю, пабудаваны горна-абагачальны камбінат па здабычы калійных угнаенняў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка падчас рабочай сустрэчы з Міхаілам Мясніковічам, старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, які нядаўна наведаў Туркменістан, у тым ліку і Гарлыкскі горна-абагачальны камбінат. — Наколькі я інфармаваны, мы ўжо атрымалі першую прадукцыю... Мы нарэшце асвоілі гэту вытворчасць, улічваючы, што ў савецкія часы, калі там даследаванні вяліся, Савецкі Саюз не рызыкнуў, не змог гэтым займацца, паколькі гэта вельмі складаная была тэхналогія ў сувязі з тымі грунтамі, якія прыйшлося нам прайсці. Але зрабілі. Значыць, тэхналогіі ў нас у гэтым плане салідныя, і гэта сігнал усяму свету, што мы можам адкрыць любую шахту і здабываць там не толькі калійныя ўгнаенні і іншае, але і любыя карысныя выкапні шахтавым спосабам, я ўжо не кажу адкрытым спосабам. Таму для нас гэта вельмі важны быў праект, і добра, што мы яго завяршылі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

З нагоды

# ПРЫКЛАД ДЛЯ ПЕРАЙМАННЯ

## Ветэраны ўносяць важкі ўклад у падтрыманне стабільнасці і спакою ў краіне

**Найбольш актыўныя ветэраны з усёй краіны сабраліся ўчора падчас урачыстасці, прысвечанай 30-годдзю адной з найбуйнейшых арганізацый краіны — Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.**

Адной з першых членаў арганізацыі павіншавала **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА**, якая агучыла прывітальныя словы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў адрас ветэранаў: «На рахунку вашай арганізацыі нямала цікавых праектаў, знакавых мерапрыемстваў і ініцыятыў. Вы ўносіце неацэнны ўклад у падтрымку стабільнасці і спакою ў нашай краіне, выхаванне падрастаючага пакалення ў духу маральнасці і патрыятызму. Жыццёвы і працоўны вопыт, прафесіяналізм і асабістыя якасці кожнага з вас з'яўляюцца прыкладам, вартым пераймання». Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ветэраны і ў далейшым будуць прымаць самы актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, садзейнічаць развіццю суверэннай беларускай дзяржавы.

Віншаванні ад імя ўрада краіны зачытала **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ**: «Дзякуючы вашай актыўнай жыццёвай пазіцыі, ініцыятыўнасці, добрасумленным адносінам да справы паспяхова вырашаюцца задачы па патрыятычным выхаванні моладзі, прапагандзе найлепшых традыцый Айчыны, кансалідацыі грамадства. Ваш бясцэнны жыццёвы вопыт і мудрая парада будуць запатрабаваны заўсёды».

Клопат аб ветэранах з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы. Сёння аўтарытэтная арганізацыя краіны аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах амаль 2,6 мільёна чалавек: гэта ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны працы, сілавых структур. Многія з іх лічаць справай гонару ўдзельнічаць у грамадскім жыцці краіны, патрыятычным выхаванні насельніцтва.

На ўласным прыкладзе выхоўвае маладое пакаленне і **Герой Савецкага Саюза Васіль МІЧУРЫН**, якому неўзабаве споўніцца 101 год. «Я не сяджу ў хаце, — гаворыць ветэран. — Я настройваю моладзь на дапамогу дзяржаве, каб яна была яшчэ больш моцнай».

Як адзначыў **старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл ОРДА**, вопыт і веды ветэранаў заўсёды былі і будуць запатрабаванымі ў працэсе развіцця нашай краіны. «У прафсаюзных справах удзельнічае шмат ветэранаў, — падкрэсліў Міхаіл Орда. — Гэта вельмі важная работа, якую мы робім па захаванні гістарычнай памяці і спадчыны. Летась мы з вамі завяршылі рэканструкцыю адной са святыняў нашай беларускай зямлі — Кургана Славы. Я ўпэўнены, што наперадзе яшчэ шмат важных і патрэбных спраў».

Па словах **старшыні Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў генерал-маёра запасу Івана ГАРДЗЕЙЧЫКА**, ветэраны ўдзельнічаюць у найважнейшых палітычных кампаніях, у рэалізацыі мерапрыемстваў органаў дзяржаўнай улады, нацыянальных праграм па сацыяльнай і прававой абароне ветэранаў, у грамадзянска-патрыятычным, працоўным і інтэрнацыянальным выхаванні моладзі. «Захоўваючы высокамаральныя традыцыі папярэдніх пакаленняў, удзячную памяць аб шматлікіх подзвігах і працоўных здзяйсненнях, ветэраны аб'яднання ўносяць свой пасільны ўклад у падтрыманне стабільнасці і спакою ў краіне, — лічыць Іван Гардзейчык. — Мы з пачуццём годнасці і гонару ўспрымаем, а таксама адчуваем сваю дзяржаўную і грамадскую запатрабаванасць, дакладна ўсведамляючы, што без нашай актыўнай грамадзянскай пазіцыі, без нашага высокага зараду патрыятызму, вернасці і адданасці не могуць быць дасягнуты высокія палітычныя і эканамічныя мэты».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

**Рэдакцыя «Ляхавіцкага весніка» выказвае шчырае спачуванне свайму шаноўнаму земляку, сябру газеты, дырэктару выдавецтва «Мастацкая літаратура» Аляксандру Мікалаевічу Бадаку ў сувязі з трагічнай смерцю ЖОНКІ. Смуткуем.**

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Аўстрыя хоча выйсці з праграмы ЕС па размеркаванні бежанцаў

Як заявіў учора канцлер Крысціян Керн пасля пасяджэння кабінета міністраў, Аўстрыя абавязалася прыняць з Грэцыі і Італіі амаль дзве тысячы бежанцаў па праграме размеркавання ЕС, але краіна і без таго выканала гэтую норму з-за патоку нелегальнай міграцыі. «Мы лічым, што для Аўстрыі трэба зрабіць выключэнне, таму што мы ўжо выканалі свае абавязацельствы. Гэтае пытанне абмяркуем з Еўрапейскай камісіяй і адправім ім пісьмо як мага хутчэй», — сказаў Керн.

У 2016 годзе міграцыйная служба Аўстрыі дапусціла да працэдуры разгляду заяў на атрыманне статусу бежанца амаль 36 тысяч чалавек. Урадам устаноўлены ліміт у 37,5 тысячы заяў, пры перавышэнні якога было вырашана закрыць мяжу і пачаць дэпартацыю бежанцаў.

## Саакашвілі стаў вядучым ток-шоу «Іншая Украіна»

«Мы запісалі на тэлеканале ZIK першую праграму «Іншай Украіны», і яна выйшла вельмі вострай. Кожны тыдзень у гэтай перадачы я буду вам паказваць такую Украіну, якой яе не паказвае больш ні адзін канал», — адзначыў Саакашвілі на сваёй старонцы ў Фэйсбуку, дадаўшы, што першы выпуск ток-шоу быў запісаны 27 сакавіка.

Пасля адстаўкі з пасады губернатара Адэскай вобласці Саакашвілі пачаў жорстка крытыкаваць прэзідэнта Пятра Парашэнку. Сваю праграму ён вядзе на фоне сабачай будкі, і гэта не выпадкова. Раней Парашэнка заявіў, што яго апаненты «ў жыцці сабачай будкі не пабудавалі», што выклікала рэзкую рэакцыю шэрагу ўкраінскіх палітыкаў, у тым ліку і Саакашвілі. Ён у адказ зазначыў, што ў бытнасць прэзідэнтам Грузіі ён будаваў для людзей, а не для сябе, як Парашэнка.

## Bild: блок Меркель і СДПГ паказалі аднолькавыя рэйтынгі за паўгода да выбараў у Бундэстаг



Кансерватыўны блок Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС/ХСС), які ўзначальвае канцлер ФРГ Ангела Меркель, за апошні тыдзень нарасціў сваю папулярнасць на адзін працэнтны пункт, да 32%, і зраўняўся па гэтым паказчыку з Сацыял-дэмакратычнай партыяй Германіі (СДПГ).

Наступныя выбары ў нямецкі парламент, па выніках якіх будуць сфарміраваны ўрад і вызначаны канцлер, пройдуць 24 верасня. На іх насельніцтва будзе галасаваць за партыі, кожная з якіх, у сваю чаргу, вылучае кандыдата на пасаду кіраўніка ўрада.

Цяпер у ФРГ кіруе кааліцыя, якую ў нямецкай палітычнай традыцыі называюць «вялікай», — ХДС/ХСС і СДПГ. Чатыры гады таму кансерватары на правах палітычнай сілы, якая набрала больш галасоў, вылучылі на пасаду канцлера Меркель, а сацыял-дэмакраты дэлегавалі ва ўрад віцэ-канцлера Зігмара Габрыэля. Паміж гэтымі партыямі размеркаваны і міністэрскія партфелі.

**Юрый ВАЛЯВАТЫ:**

■ Блізкая ўлада

# «ДЗВЕРЫ МАЙГО КАБІНЕТА ЗАЎЖДЫ АДЧЫНЕНЫ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ»

**Чарговая прамая лінія, у якой узяла ўдзел карэспандэнт газеты «Звязда», адбылася ў Мастах. На пытанні насельніцтва адказваў старшыня Мастоўскага райвыканкама Юрый ВАЛЯВАТЫ.**



Першы званок прагучаў нават раней за прызначаны час. Тэлефанавала Зоя Якаўлеўна, якая жыве ў адным з дамоў па вуліцы Станцыённай. Жанчына падняла пытанне добраўпарадкавання вуліцы.

— Юрый Мікалаевіч, мужу-інваліду — 88 гадоў, мне — 86. На вуліцы няма ні лiўнёўкі, ні каналізацыі, узровень грунтовых вод вельмі высокі, вада стаіць у двары, — звярнулася яна да старшыні райвыканкама. — Ямы на дарозе такія, што ногі можна зламаць. Што ўжо казаць пра машыны...

— Я ведаю гэтую праблему. Што датычыцца вашай вуліцы, сёлета ажыццявім ямачны рамонт. Калі казаць пра арганізацыю лiўневай каналізацыі, пакуль няма праектна-каштарыснай дакументацыі, я нічога зрабіць не магу.

Але старшыня райвыканкама прапанаваў часовую дапамогу і тут жа, не перарываючы размовы з Зояй Якаўлеўнай, патэлефанаваў начальніку раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Апошні, у сваю чаргу, паабяцаў неўзабаве выехаць і адпампаваць застаялую ваду. Аб гэтым Юрый Валяваты паведаміў мясцовай жыхарцы і напрыканцы размовы пацікавіўся станам здароўя мужа, а таксама тым, ці ў поўнай меры інваліду аказваецца медыцынская дапамога.

Не паспеў старшыня пакласці трубку, як на сувязь выйшла Данута Яўгенаўна Радзінская. Жанчына, якая жыве ў вёсцы Масты Правыя, пацікавілася ў кіраўніка раёна, ці атрымае яе муж у канцы месяца заробак.

— А ёсць сумненні, што можа не атрымаць? — удакладніў Юрый Мікалаевіч.

— За студзень атрымаў. А як далей будзе, не ведаю, — пачулі на тым канцы провада.

— Калі ваш муж у мінулым месяцы добрасумленна працаваў, вядома, ён атрымае заробленыя ім грошы.

Пакуль чакалі чарговага званка, старшыня Мастоўскага райвыканкама расказаў, што прамая лінія супала з прыёмным днём. Прычым ён ужо паспеў выслухаць некалькі чалавек. У прыватнасці, аднаго з мастаўчан у раённую адміністрацыю прывяло сумненне ў замене газавай пліты. Тэрмін дзеяння, які дазваляе карыстацца газавай плітой, у мясцовага жыхара скончыўся. Супрацоўнікі службы газу папярэдзілі, што, калі той не заменіць пліту, яны адключаць газазабеспячэнне.

— Ніхто не растлумачыў гэтаму чалавеку, навошта ён абавязаны памяняць газавую пліту, — заўважыў Юрый Валяваты. — Я паспрабаваў яму данесці, што ў першую чаргу гэта трэба зрабіць у мэтах бяспекі. Хацеў ён мяне пачуць ці не — гэта ўжо іншае пытанне.

Звініць тэлефон. На сувязі — Лізавета Пятроўна. Жанчыну турбуе стан дарогі ў вёсцы Харціца. Уважліва выслухаўшы просьбу, старшыня райвыканкама паведаміў, што запланавана грэйдзіраванне дарожнага палатна, але ўдакладніў, што патрэбна пачакаць добрых умоў: пры вільготным надвор'і дарожныя работы якасных вынікаў не дадуць.

— Тут яшчэ праблемны з'езд, — дадала жанчына.

— Той з'езд, пра які вы кажаце, несанкцыянаваны. Санкцыянаваны з'езд знаходзіцца ў нармальным стане, — адказаў старшыня.

— А ці будзе ажыццёўлены рамонт па суседняй вуліцы? — жыхарка Харціцкага сельскага Савета вырашыла агучыць усе набалелыя пытанні.

— Абавязкова!

— Тады добра. Дзякуй!

Усяго падчас прамой лініі старшыні Мастоўскага райвыканкама патэлефанавалі тры чалавекі. Калі ўлічыць амаль дзясятак заяўнікаў, якія ў той жа дзень прыёму сустрэліся з кіраўніком раёна асабіста, наўрад ці можна казаць аб невысокай актыўнасці насельніцтва.

— Асноўная прычына невялікай колькасці званкоў — штодзённая работа спецыялістаў райвыканкама, — перакананы Юрый Валяваты. — Кожны дзень нехта з маіх намеснікаў вядзе прыём грамадзян, рэгулярна працуем з людзьмі ў межах дня інфармавання, 24 гадзіны ў суткі можна патэлефанаваць дзяжурнаму. Амаль штодзень я дзесьці бываю: ці гэта прамысловае, ці будаўнічае прадпрыемства, або выязджаю ў вёску, дзе заўсёды можна задаць надзённае пытанне. Дзверы майго кабінета заўжды адчынены, незалежна ад таго, вяду я сёння прыём грамадзян ці не. Напэўна, трэць насельніцтва раёна ведае мой нумар тэлефона. Прынцып работы — быць заўсёды на сувязі.

Як расказаў старшыня райвыканкама, у апошні час найбольш людзей хвалюе пытанне працаўладкавання. Кожнаму ахвотнаму прапаноўваюць вартае працоўнае месца. Іншае пытанне, хоча чалавек працаваць ці не.

**Веранiка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# ...БО ЦУКАР МНЕ КУДЫ САЛАДЗЕЙШЫ

**Не ведаю, як іншыя, а я, здаецца, заўсёды марыў, як добра было б, калі б мы, беларусы, жылі ў беларускамоўным асяроддзі: чулі вакол сваю родную мову, бачылі яе на шыльдах, чыталі на ёй... У тым ліку і газеты.**

Помню, у савецкія часы не толькі «Звязда», але і многія іншыя газеты друкаваліся па-беларуску... Цяпер жа ёсць людзі, якія бяруцца сцвярджаць, што беларуская мова штучная, што яе прыдумалі ледзь не ў XX стагоддзі. Уявіце: селі нейкія «разумнікі», памазгавалі і «выдалі на гара» амаль сто тысяч слоў (столькі ў слоўніку Крапівы)...

Ды смеху ж варта: я колькі помню сябе, заўсёды чуў менавіта беларускую мову. Мая маці, напрыклад, была непісьменнай, значыць, недзе вычытаць словы «лялька», «пчаляр», «сподак», «бусел», «буська», «байка» і безліч іншых яна проста не магла. Але ж ведала... Адкуль? Ад сваёй маці, ад бабулі, ад іншых людзей.

Зрэшты, у нашай вёсцы, якая заўсёды размаўляла па-беларуску, былі і тыя, якім іншая мова падабалася больш. Памятаю, дзяўчаты ездзілі на заробкі ў Саратаўскую вобласць, і адна, вярнуўшыся, ужо лічыла, што *сахар* — гэта куды саладзей, чым *цукар*, што лепей *чтокать*, а не *штокаць*, але ж вяскоўцы з яе толькі пасмейваліся.

Так што мая беларуская мова ад іх — ад маці, ад землякоў, ад настаўніка Фёдара Трафімавіча Навумовіча, які заўсёды гаварыў толькі па-нашаму... А яшчэ — ад «Звязды», якую я выпісваю з квартала ў квартал, каб чытаць, каб не забывацца родныя словы.

**В. М. Пяшэвіч,**
*в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.*

**<u>P.S.</u> Васіль Мікітавіч аформіў падпіску на «Звязду». Нехта, магчыма, забыўся, не змог альбо не захацеў, бо часам і сапраўды бывае багата ў газеце рэкламы ды балансаў. Але ж сталыя нашы падпісчыкі ўжо ведаюць, што скончыцца сакавік—красавік, і будзе менш гэтых абвестак. А «Звязда» — застанецца: яна — як і сто гадоў таму — будзе прыходзіць да чытачоў, якія, хочацца верыць, памятаюць, што падпісацца на газету можна заўсёды. *Па сакрэце: не выключана, што нават зараз, пасля афіцыйнага завяршэння падпісной кампаніі. Паспрабуйце. Хутчэй за ўсё паштавікі пойдуць вам насустрач.* І тады вы будзеце разоў на тыдзень цягам месяца, двух ці квартала атрымліваць родную газету на роднай мове.**

**Альбо — на першай дзяржаўнай, якую, жывучы ў Беларусі, усё ж такі трэба ведаць, а ведаючы, не забываць.**

■ Прыёмная кампанія — 2017

# ЦІ ВЫХОДЗІЦЬ З ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ АЎДЫТОРЫІ?

## Адкарэкціраваны пэўныя нюансы праходжання ЦТ




Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Пра змяненні, што былі ўнесены ў Правілы прыёму ў ВНУ і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, стала вядома яшчэ ў пачатку года. У прыватнасці, абітурыенты даведаліся пра тое, што цяпер яны змогуць здаваць на ЦТ чатыры дысцыпліны замест трох (адну з дзяржаўных моў плюс тры профільныя прадметы), а таксама пра павелічэнне тэрміну дзеяння сертыфікатаў ЦТ на два гады. Днямі пастановай урада былі ўнесены карэктывы ў Парадак арганізацыі і правядзення цэнтралізаванага тэсціравання з улікам новых Правілаў прыёму, зацверджаных кіраўніком дзяржавы.**

Згодна з гэтым дакументам, у выпадку, калі абітурыент зарэгіструецца для праходжання ЦТ больш чым па чатырох вучэбных прадметах, ён будзе допушчаны да ўдзелу толькі па чатырох першых прадметах (згодна з графікам правядзення ЦТ), на які ён зарэгістраваўся. Таксама ў Палажэнні аб парадку арганізацыі і правядзення ЦТ падрабязна рэгламентавана магчымасць выхаду з экзаменацыйнай аўдыторыі падчас здачы ЦТ.

Абітурыенты змогуць выходзіць з аўдыторыі па ўважлівай прычыне (дрэннае самаадчуванне, фізіялагічныя патрэбы і інш.) падчас праходжання ЦТ толькі ў суправаджэнні арганізатара, які забяспечвае правядзенне цэнтралізаванага тэсціравання па-за аўдыторыяй. Пры выхадзе абітурыент пакідае экзаменацыйныя матэрыялы і лісты для рабочых запісаў на сваім працоўным месцы ў аўдыторыі побач з дакументам, які сведчыць яго асобу. Адказны арганізатар перад гэтым у прысутнасці абітурыента правярае камплектнасць пакінутых ім экзаменацыйных матэрыялаў. **Час знаходжання абітурыента па-за аўдыторыяй уключаецца ў агульны час праходжання цэнтралізаванага тэсціравання па вучэбным прадмеце, гэта значыць, што ніхто не будзе персанальна падаўжаць экзамен для асобна ўзятага чалавека.** Аб гэтым абітурыент павінен быць папярэджаны загадзя, да выхаду з аўдыторыі, каб узважыць усе «за» і «супраць». Факт выхаду за межы аўдыторыі фіксуецца адказнымі арганізатарамі ў пратаколе правядзення цэнтралізаванага тэсціравання.

Пасля вяртання абітурыента ў аўдыторыю для праходжання ЦТ адказны арганізатар паўторна правярае ў яго прысутнасці камплектнасць экзаменацыйных матэрыялаў, якія знаходзяцца на рабочым месцы абітурыента.

Таксама ў абноўленым Парадку арганізацыі і правядзення ЦТ ёсць і пункт, які ўлічвае тую акалічнасць, што сертыфікаты цяпер будуць дзейнічаць два гады. Напрыклад, абітурыент можа не паступіць у бягучым годзе ў ВНУ, згубіць ці сапсаваць свой сертыфікат, а на наступны год вырашыць скарыстацца сваімі мінулагоднімі вынікамі ЦТ. У гэтым выпадку ён зможа звярнуцца ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, каб атрымаць дублікат сертыфіката. Дублікаты будуць прызнавацца сапраўднымі да канца каляндарнага года, які ідзе за годам, у які здавалася цэнтралізаванае тэсціраванне.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*



## ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1, состоящий из:<br>- капитальное строение инв. №231/С-10788, наименование – «Мини-кафе», общей площадью 51,1 кв. м (составные части и принадлежности: терраса, крыльцо, пандус, пешеходная часть, сети электроснабжения), расположенное на земельном участке с кадастровым №220500000001000928 площадью 0,0404 га по адресу: Витебская обл., Бешенковичский район, М-3, 1, наименование – торговое помещение, стоимостью 52 110 руб. 00 коп.<br>- сооружение, специализированное коммунального хозяйства инв. №231/С-10790, наименование «Хозфекальная канализация» протяженностью 27 м, расположенное на на земельном участке с кадастровым №220500000001000928 площадью 0,0404 га по адресу: Витебская обл., Бешенковичский район, М-3, 1, стоимостью 846 руб. 00 коп.;<br>- рекламный модуль «Крупенино 24 часа Мини-кафе» (инвентарный №2819), стоимостью 2 789 руб. 00 коп.<br>Общая стоимость лота составляет <u>55 466 рублей 10 копеек (пятьдесят пять тысяч четыреста шестьдесят шесть рублей десять копеек)</u> |
| **Собственник (владелец) имущества** | Зарегистрировано за унитарным предприятием областной коммунальной собственности «База отдыха «Крупенино» (УНП 300601277) |
| **Наличие обременений** | Отсутствуют |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская обл., Бешенковичский район, М-3, 1 |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 20.04.2017 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1<br>www.vitebskjust.gov.by.<br>Судебный исполнитель – Ходунькин Сергей Сергеевич, тел./факс (80212) 614023.<br>Начальник отдела – Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 614015 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, <u>не позднее 15.00 19.04.2017 г.</u><br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.<br>Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by |

# Каб добраўпарадкаванне да пажару не давяло

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У некалькіх пажарах нават ёсць пацярпелыя. Напрыклад, 12 сакавіка з дыягназам «апёк полымем твару 1, 2, 3 ступеняў» у аддзяленне Мінскай гарадской бальніцы была дастаўлена жанчына 1961 года нараджэння. Мінчанка атрымала траўму напярэдадні, калі спальвала смецце ў сябе на дачы ў Капыльскім раёне. Вярнуўшыся ў сталіцу, яна адчула сябе дрэнна і звярнулася па дапамогу да медыкаў.

А 23 сакавіка ў хірургічнае аддзяленне Шчучынскай раённай бальніцы быў шпіталізаваны мясцовы жыхар. Ён атрымаў апёкі твару і рук — усяго яны занялі каля 2% плошчы цела. Аказалася, што, знаходзячыся ў вёсцы Буйвічы, ён спальваў смецце. У той момант, калі ён стаяў вельмі блізка да вогнішча, нечаканы парыў ветру імгненна здзьмуў полымя ў яго бок. Праз некаторы час адчуў боль і набраў нумар 103.

Асаблівасць апёкавай траўмы ў тым, што чалавек адразу не адчувае цяжар яе наступстваў. Самаадчуванне пагаршаецца толькі праз некаторы час. І з-за гэтай акалічнасці лячыць яе становіцца цяжэй.

Часцей за ўсё ахвярамі выпальвання расліннасці становяцца людзі ва ўзросце. У іх запаволеная рэакцыя, часта яны не могуць збегчы, пакуль агонь не перарэзаў шляхі адступлення. Да гэтага дадаецца і моцнае хваляванне з-за ўсведамлення зробленага. Таму лепш за ўсё праведаць пажылых сваякоў у вёсцы і арганізаваць усю работу за іх.

— Пазбаўляцца ад старой сухой травы можна. Іншая справа — як гэта правільна зрабіць. А ўсяго толькі варта зважаць на элементарныя правілы бяспекі, — раіць Віталь Навіцкі. — Па-першае, надвор'е мусіць быць бязветраным. Па-другое, давайце прааналізуем выпадкі, якія скончыліся смерцю. Усё пачыналася з таго, што людзі кідалі запалку, не прыняўшы ніякіх дадатковых мер загадзя. Дык вось, спярша трэба акапаць месца, дзе вы будзеце спальваць расліннасць. Яно не павінна быць вялікім. Пад рукой трэба мець любы сродак тушэння. Гэта вядро з вадой, вогнетушыцель ці вядро з пяском і рыдлёўка. Касцёр ні ў якім разе нельга пакідаць без нагляду. Высахлыя сцяблiны гараць як порах, раскідваючы іскры. Некалькіх хвілін дастаткова для таго, каб пачаўся пажар. З-за гэтага трэба падкідваць «паліва» невялікімі порцыямі, а таксама вытрымліваць пэўную адлегласць ад прадметаў, якія могуць загарэцца. Напрыклад, для пабудоў гэта — дзесяць метраў, для лесу — дваццаць, а для скірдаў саломы — і ўвогуле мінімум складае трыццаць метраў. Зрэшты, ва ўмовах сельскай мясцовасці дамагчыся такой адлегласці нескладана.

А, напрыклад, аўтар гэтых радкоў для ўтылізацыі сухой травы карыстаецца старой жалезнай бочкай, якая звонку чымсьці нагадвае печку-буржуйку са старых фільмаў.

### Май на ўвазе

Артыкул 15.57 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях рэгламентуе: незаконнае выпальванне расліннасці, траў на корані, а таксама ржышча і пажніўных рэшткаў на палях або непрыняцце мер па ліквідацыі выпальванняў на зямельных участках цягнуць накладанне штрафу ў памеры ад 10 да 40 базавых велічынь. Сёння гэта ад 230 да 920 рублёў.

— Калі вы бачыце, што дзесьці ў полі гарыць трава, то лепш як мага хутчэй пакінуць месца пажару і выклікаць ратавальнікаў па нумары 101.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

# М.ART.КАНТАКТ УРАЗІЛІ БЕЛАРУСКІЯ СПЕКТАКЛІ

## У Магілёве развіталіся з XII Міжнародным маладзёжным тэатральным форумам

**Тэатральны тыдзень, калі кожны вечар разрываешся паміж трыма-чатырма пастаноўкамі, бо хочацца ўбачыць усё, а рэальна атрымліваецца толькі адну-дзве, праляцеў як імгненне. На імправізаванай сцяне водгукаў у драмтэатры не засталося вольнага месца. Глядач не скупіўся на шчодрыя кампліменты нават у тых выпадках, калі дасведчаныя эксперты аднагалосна выказваліся супраць. Як гэта было з «Дарагой Аленай Сяргееўнай» ТЮГа з Санкт-Пецярбурга. Моладзь выстройвалася ў чаргу, каб напісаць удзячны водгук. А тэатразнаўцы заявілі: нефармат. Такога наогул не павінна быць на фестывалі.**



**«Браты Карамазавы» Льва Эрэнбурга. Сцэна са спектакля.**

Конкурсу на фестывалі няма, але ўсе крытыкі сышліся ў меркаванні, што гэтым разам беларускія тэатры былі як ніколі на вышыні. Магілёву пашчасціла паглядзець чатыры найлепшыя пастаноўкі мінулага года — «Гэта ўсё яна» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, «Саша, вынесі смецце» — нашумелая драма ў выкананні артыстаў Беларускага маладзёжнага тэатра, «Лондан» абласнога тэатра імя В. Дуніна-Марцінкевіча з Бабруйска і монаспектакль «Сіняя-сіняя» Магілёўскага тэатра лялек. Экспертаў таксама парадавала магчымасць убачыць работы адразу некалькіх вядомых рэжысёрскіх школ і нават параўнаць на прыкладзе аднаго і таго ж спектакля — «Браты Карамазавы». Вучні Эмунтаса Някрошуса з віленскага тэатра-студыі Theaomai паказалі свой твор у дэкарацыях этнаграфічнага музея. Вытрымаць некалькі гадзін тэксту на чужой для слыху літоўскай мове было цяжкавата, але гледачы не пашкадавалі. Як і тыя, хто прыйшоў на тройчы адзначаную Гран-пры пастаноўку Льва Эрэнбурга ў выкананні яго вучняў з тэатра-студыі «Невялікі драматычны тэатр».

Для тэатральнага асяроддзя форум наогул неацэнны. Ну дзе яшчэ магілёўскія акцёры-пачаткоўцы маглі б трапіць на майстар-клас таго ж Льва Эрэнбурга, як не на гэтым форуме? А яшчэ чыткі, штодзённыя абмеркаванні спектакляў, круглы стол, прэзентацыі — усе ўмовы для таго, каб выпрацаваць добры тэатральны густ.

«За апошнія 4—5 гадоў форум сур'ёзна змяніўся, — адзначыў **доктар філалагічных навук, дацэнт Варшаўскага ўніверсітэта Андрэй МАСКВІН**. — Гэтым разам вельмі парадаваў добры падбор спектакляў розных узроўняў. І тое, што залы былі цалкам запоўненыя».

Польскі тэатразнаўца — даўні прыхільнік форуму і беларускага тэатра наогул. Ён правёў вялікую работу, каб прааналізаваць яго вытокі. Вынікам стала кніга «Беларускі тэатр 1920—1930-х. Адабраная памяць». Матэрыял для яе аўтар на працягу некалькіх гадоў шукаў у беларускіх і маскоўскіх архівах. **Мастацкі кіраўнік нацыянальнага акадэмічнага драмтэатра імя Якуба Коласа Валерый АНІСЕНКА** сказаў, што гэта той выпадак, калі адзін чалавек зрабіў работу цэлага інстытута. Ён ліквідаваў прабел у гісторыі беларускага тэатра, сабраў каштоўны архіўны матэрыял, якога не хапала, каб аднавіць адрэзак гісторыі пра рэпрэсаваных дзеячаў тэатра.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

**Организатор торгов, ликвидатор ООО «Производственно-торговая компания «Мастервуд» – Никитина Алеся Федоровна, действующая на основании Протокола внеочередного собрания участников ООО «ПТК «Мастервуд» от 03.06.2016 г., сообщает о проведении торгов по продаже имущества, а именно:**

**Предмет торгов:**

| № лота | Наименование лота | Кол-во, ед. | Начальная цена за 1 ед. лота в белорусских рублях | Шаг торгов 5% | Задаток 10% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автотранспортное средство Renault Masscot. 2007 г.в., VIN VF354ANA000037378 | 1 | 22 793,94 | 1 139,7 | 2279,4 |
| 2 | Станок для шлифовки стекла GTC-011L | 1 | 1 614,97 | 80,75 | 161,5 |
| 3 | Станок торцовочный 2-пильный мод. TR2ACE | 1 | 10 483,68 | 524,18 | 1 048,37 |
| 4 | Станок универсальный фрезерный FUS-22 | 1 | 4 839,48 | 241,97 | 483,95 |
| 5 | Станок форматно-раскроечный круглопил мод. Actra400CE | 1 | 13 984,26 | 699,21 | 1 398,43 |
| 6 | Пылесос CTL26E | 2 | 506,28 | 25,31 | 50,63 |
| 7 | Кромкооблицовочный станок BRANDT Optimal KTD 72 | 1 | 2 280,1 | 114,00 | 228,00 |

Продавец – ООО «ПТК «Мастервуд». Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

До подачи заявления на участие в торгах Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичной форме по следующим платежным реквизитам: ООО «ПТК «Мастервуд», р/с 3012212717007, вид валюты 933 (белорусские рубли), код банка 270 в ЗАО «Альфа-банк», УНП 191605354.

Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 14 апреля 2017 года, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 46, помещение 5.

Окончание приема заявок на участие в торгах прекращается за 7 дней до даты, на которую назначено проведение торгов.

Задаток должен поступить на указанный счет Продавца не позднее 14 апреля 2017 года.

Торги состоятся 21 апреля 2017 в 9.00 по адресу: г. Минск, ул. Гурского, дом. 46, помещение 5.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в объявлении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в объявлении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации, – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Победитель торгов возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней со дня проведения торгов.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются в день проведения торгов.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

С дополнительной информацией о предмете торгов можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 46, помещение 5. Тел. (029) 645 19 47

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **Лот №1.** – Автомобиль NISSAN VANETTE КАРГО, 1999 г.в., цвет – красный, тип – легковой минивэн, гос. номер 5644АО-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова VSRDEVC23U0091599.<br>Стоимость лота – 3 277 руб. 50 коп. (три тысячи двести семьдесят семь рублей пятьдесят копеек).<br>**Лот №2.** – Автомобиль NISSAN PATROL, 2004 г.в., цвет – серебристый металлик, тип – легковой джип, гос. номер 1699АО-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова (рама) JN1TESY61U0142488.<br>Стоимость лота – 19 566 руб. 20 коп. (девятнадцать тысяч пятьсот шестьдесят шесть рублей двадцать копеек).<br>**Лот №3.** – Автомобиль ГАЗ 3302, 1999 г.в., цвет – светло-серый, тип – грузовой, бортовой, тентовый, гос. номер АА8921-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова (рама) 330200X0032880, 330200X1759175.<br>Стоимость лота – 2 097 руб. 60 коп. (две тысячи девяноста семь рублей шестьдесят копеек).<br>**Лот №4.** – Автомобиль ВАЗ 2121, 1993 г.в., цвет – темно-красный, тип – легковой специальный джип, гос. номер 4111АК-2, в рабочем состоянии, отсутствует аккумуляторная батарея, номер кузова (рама) XTA212100P0993650.<br>Стоимость лота – 773 руб.30 коп. (семьсот семьдесят три рубля тридцать копеек) |
| **Собственник (владелец) имущества** | Зарегистрировано за унитарным предприятием областной коммунальной собственности «База отдыха «Крупенино» (УНП 300601277) |
| **Наличие обременений** | Отсутствуют |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Витебск, ул. В. Интернационалистов, 31 (автостоянка «Крупенино») |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 21.04.2017 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома.<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by.<br>Судебный исполнитель – Ходунькин Сергей Сергеевич, тел./факс (80212) 614023.<br>Начальник отдела – Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 614015 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома №3642903001037 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 20.04.2017 г.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.<br>Более подробную информацию можно получить на сайте Главного управления юстиции Витебского облисполкома www.vitebskjust.gov.by |

## ИНФОРМАЦИЯ О СУЩЕСТВЕННЫХ ФАКТАХ

УНП 190374344

**(событиях, действиях)**

**О выплате дивидендов по акциям за 2016 год**

| | |
|---|---|
| **Полное наименование акционерного общества** | Открытое акционерное общество «Гастроном «Блеск» |
| **Местонахождение акционерного общества** | г. Минск, ул. Шаранговича, 51 |
| **Дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям** | 28 марта 2017 года |
| **Дивиденды, начисленные на одну акцию, по:<br>- простым акциям<br>- привилегированным акциям (типам привилегированных акций)** | 0,17451 руб.<br>– |
| **Срок и порядок выплаты дивидендов** | Дивиденды, приходящиеся на долю собственности г. Минска путем перечисления на расчетный счет финансового отдела Администрации Фрунзенского района г. Минска не позднее 22.04.2017.<br>Физическим лицам в кассе Общества с 03.04.–05.04.2017, с 8.00 до 15.00, юридическому лицу путем перечисления на расчетный счет с 03.04.–05.04.2017 |

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ЗА 2016 Г.

## ОАО «КАМАЙСКИЙ-АГРО»

211862, аг. Камаи, Поставский р-н, РБ, ул. Гагарина, 17.
тел./ф. 8(02155) 5-43-30/5-44-70, УНП 300077290.
Основные виды деятельности:
производство сельскохозяйственной продукции.
Депозитарий: ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, пр-т Жукова, 3

| Наименование показателей | На начало отчетного периода | На конец отчетного периода | ПАССИВ | | |
|---|---|---|---|---|---|
| АКТИВ | | | 3. Собственный капитал | 16722 | 14670 |
| 1. Долгосрочные активы | 22986 | 19518 | 4. Долгосрочные обязательства | 2959 | 2309 |
| 2. Крастосрочные активы | 6743 | 6641 | 5. Краткосрочные обязательства | 10048 | 9180 |
| **БАЛАНС** | **29729** | **26159** | **БАЛАНС** | **29729** | **26159** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ**

| Наименование показателей | На начало отчетного года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 6684 | 5025 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 7622 | 5920 |
| Прибыль (убыток) от реализации | -1336 | -1360 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | -1682 | -1131 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | -770 | -238 |
| Чистая прибыль (убыток) | -2452 | -1369 |

Директор Сарапененко А.В. Гл. бухгалтер Гинько М.В.

**Холопеничский сельский исполнительный комитет Крупского района Минской области сообщает об отказе от проведения аукциона, назначенного на 4 апреля 2017 года.**

УНП 600176988

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

29 сакавіка 2017 г.
№ 10 (394)



стар. 2

**Вываз адходаў у вёсцы — праблема... светапоглядная**



стар. 6

**Таямніцы дома на Шпалернай**



стар. 8

**Асаблівасці жыцця ў акружэнні лясоў**

МАБІЛЬНЫ МАНІТОРЫНГ

# «НАША ЗАДАЧА — ПАДКАЗВАЦЬ І ПАПЯРЭДЖВАЦЬ»



**Гомельская гарадская мабільная група па маніторынгу выканання правілаў аховы працы і прамысловай санітарыі звычайна выязджае ў рэйды два разы на тыдзень.**

Як правіла, у ёй — прадстаўнікі дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы, санэпідстанцыі, наркалагічнага дыспансера, інспекцыі прыродных рэсурсаў, энерганагляду, МНС, міліцыі, ДАІ, пракуратуры, прафсаюзаў і ідэалогіі, дэпутаты. Куды канкрэтна група накіруецца сёння, не ведаюць нават тыя спецыялісты, якія ўваходзяць у яе склад. І толькі пасля таго, як усе на месцы, а аўтобус рухаецца, **кіраўнік групы, ён жа начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама, Аляксандр КЛЮЧЫНСКІ** агучвае маршрут.

Мэты такіх паездак кожнаму з удзельнікаў каманды вядомы дасканала. Большасць не першы раз едзе на тое ці іншае прадпрыемства. Між тым, магчыма, дзякуючы такім не заўсёды прыемным для кіраўнікоў кантрольным праверкам папярэджаны сотні парушэнняў, якія тэарэтычна маглі прывесці да траўміравання працаўнікоў. Зусім пазбегнуць трагедый не атрымліваецца, але ж кожны выпадак — прыклад для падрабязнага «разбору палётаў» на іншых прадпрыемствах.

Так адбываецца і на Гомельскім заводзе пускавых рухавікоў. У 1990-я гады тут працавала да 3,5 тысячы чалавек. Сёння — менш за сотню. Былое вялікае прадпрыемства цяпер уваходзіць у склад холдынга «Мінскі маторны завод». На плошчы амаль у 12 гектараў размешчаны офісныя, вытворчыя і складскія памяшканні. Многія сёння здаюцца ў арэнду. Як тэатр пачынаецца з вешалкі, так і прамысловае прадпрыемства пачынаецца з прахадной. Зоркае вока кантралёраў адразу ж заўважае пэўныя парушэнні: кантралёр КПП не правярае кожны раз дакументы асоб, якія працуюць на арандаваных плошчах. Таксама высвятляецца, што адключаны блакіратар у электроннай сістэме пропуску.

стар. 3

СВЯТЛО Ў АКНЕ

# АБ'ЕКТ АСАБЛІВАЙ АПЕКІ

**Вёска Дзікева — адзін з населеных пунктаў на старажытным бальшаку Лужкі — Германавічы — Новый Пагост. У наш час гэты шлях апынуўся сярод незапатрабаваных дарог вобласці і раёна, і таму многія вёскі, у тым ліку і Дзікева, што ў Шаркаўшчынскім раёне, сталі прыходзіць да заняпаду. З шумнай і працавітай вёска ператварылася ў ціхі лясны куточак, стала месцам пражывання пенсіянераў і дачнікаў.**

Дзесяць гадоў таму закрылася мясцовая школа. Тым не менш вёска на слыху, і ў жыцці рэгіёна адыгрывае важную ролю. Бо ў ёй працуе адно з аддзяленняў цэнтра сацыяльнай дапамогі насельніцтву, а менавіта — аддзяленне кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў. Прытулак, альбо інтэрнат, якраз і размясціўся ў будынку базавай школы. Тым самым выратавана ўтульнае памяшканне і захавана інфраструктура, неабходная для такіх спецыфічных устаноў, як гэтая. Захавалася і месца працы для вяскоўцаў. Калі заязджаеш у вёску, адразу кідаецца ў вочы белы цагляны дом з шырокімі вокнамі. Вакол — акуратна прыбраная тэрыторыя, дарожкі, вымашчаныя тратуарнай пліткай, лужок перад фасадам, зацярушаны мяккім сняжком. Парадак — візітная картка дома і яго гаспадароў. З 2010-га **аддзяленнем загадвае Наталля ХРОЛ** — былая настаўніца пачатковых класаў. Працаваць у сценах роднай школы для яе — сапраўдны паварот лёсу.

— У нашым аддзяленні знаходзяцца трыццаць сем чалавек — пятнаццаць мужчын і дваццаць дзве жанчыны, усе яны — жыхары Шаркаўшчынскага раёна і маюць патрэбу ва ўходзе і асаблівай апецы, — кажа пры сустрэчы Наталля Бранiславаўна. — Наш дом — вялікая і дружная сям'я, і ў ёй пануе светлы настрой.

стар. 7



У пакоі для адпачынку.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Беларуска-індыйскіх лекаў стане больш

**Беларусь гатова павялічыць колькасць сумесных фармацэўтычных праектаў з Індыяй**

**Аб гэтым заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з дэлегацыяй фармацэўтычных кампаній з Індыі. Нагадаем, індыйскія прадстаўнікі выступілі партнёрамі беларускага боку на міжнароднай выстаўцы «Ахова здароўя Беларусі — 2017», што прайшла ў Мінску.**



Фота БЕЛТА.

На гэты момант рэалізуецца тры беларуска-індыйскія інвестыцыйныя праекты ў галіне вытворчасці лекаў. Парламентарый выказаў надзею, што пасля наведвання Беларусі дэлегацыяй індыйскіх фармацэўтычных кампаній колькасць сумесных спраў павялічыцца.

«У нас вельмі шматпрофільнае супрацоўніцтва, і я рады таму, што яно змяшчае не толькі гандлёвыя адносіны, але досыць актыўна развіваюцца і інвестыцыйныя праекты», — адзначыў спікер верхняй палаты. Сёння паміж Беларуссю і Індыяй ажыццяўляецца сумесная работа ў навукова-тэхнічнай галіне, у падрыхтоўцы кадраў ва ўніверсітэтах. На думку Міхаіла Мясніковіча, гэта сведчыць пра разнастайнасць формаў нашай працы і добрых перспектывах.

— У цэлым мы задаволены супрацоўніцтвам з Індыяй на ўсіх узроўнях. І бачым вялікі патэнцыял, які яшчэ не да канца запатрабаваны, — падкрэсліў сенатар.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

## Парламентарыі супраць гібрыдных войнаў

**Беларуская парламенцкая дэлегацыя наведала Паўночную сталіцу Расіі**

**26—28 сакавіка 2017 года парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ прыняла ўдзел у Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (МПА СНД) і Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (ПА АДКБ) у Санкт-Пецярбургу.**

У ходзе пасяджэння Савета ПА АДКБ была прынята Заява з нагоды 25-годдзя падпісання Дагавора аб калектыўнай бяспецы, 15-годдзя Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы і 10-годдзя Парламенцкай асамблеі АДКБ, а таксама разгледжаны пытанні каардынацыі знешнепалітычнай дзейнасці парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ у іншых міжнародных парламенцкіх арганізацыях, удзелу парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ у чарговай летняй сесіі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, падрыхтоўкі міжпарламенцкіх слуханняў па пытаннях эфектыўнага процідзеяння сістэмы калектыўнай бяспекі гібрыдным войнам у сучасных умовах.

## Узаемадзеянне з пятай рэспублікай

**Старшыня Пастаяннай камісіі верхняй палаты сустрэўся з французскім пасолм**

**На мінулым тыдні ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргея РАХМАНАВА з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Французскай Рэспублікі ў Беларусі Дзідзье КАНЕСАМ.**

Бакі абмеркавалі развіццё беларуска-французскага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння, а таксама шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і іншых сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

АБМЯРКУЕМ

# МЕСЦЫ ШУКАЕМ, СПІСЫ ЎДАКЛАДНЯЕМ

**Індывідуальны падыход — тое, пра што кажа кожны дэпутат. Цяпер у сельсаветах ідзе работа з людзьмі, падчас якой высвятляецца, хто і чаму трапіў у спісы ўтрыманцаў. Некаторых ужо змаглі і працаўладкаваць.**

Так, у Рэчыцкім сельсавеце Чэрыкаўскага раёна ўжо знайшлі работу пяцёра жыхароў. У сельвыканкаме гавораць, што яшчэ некалькіх возьмуць на аснове дамовы на сезонныя работы. Напрыклад, на выгул жывёл, рамонт агароджаў грамадскіх могілак ці фарбаванне плота. Спісы ўтрыманцаў ужо падкарэктавалі. Першапачаткова трапілі туды і тыя, хто зараз жыве ў Расіі. Дарэчы, гэта даволі распаўсюджаная памылка. **Старшыня Шаршунскага сельскага Савета дэпутатаў Мінскага раёна Мікалай ПАНКЕВІЧ** гаворыць, што і яны дэталёва правярылі тых, хто атрымаў ліст на збор. «Зараз выходзім на прадпрыемствы, каб удакладніць вакансіі і магчымасці працаўладкаваць людзей. Мы, улады, павінны дапамагаць, прадастаўляць месцы. Але дзейнічаць чалавек павінен сам».

На фоне іншых пазітыўна выглядае Шчорсаўскі сельсавет Навагрудскага раёна. **Генрых ЛУКОЎСКІ, старшыня Савета дэпутатаў,** гаворыць, што з яго тэрыторыі толькі тры чалавекі трапілі ў спісы, ды і тыя, як высветлілася, цяпер пражываюць па-за межамі Беларусі. «У нас насельніцтва хто ў Шчорсах працуе, хто ў лясніцтве. Некаторыя сваю гаспадарку трымаюць. Ёсць тыя, хто даглядае бацькоў. У цэнтры занятасці на ўліку тры чалавекі — мы іх бяром з вясны па восень на работы па добраўпарадкаванні населеных пунктаў».

**Мікалай БАЦЮШКОЎ, старшыня Ціхініцкага сельскага Савета дэпутатаў Рагачоўскага раёна,** у дзень нашай размовы ўжо аддаў у райвыканкам заявы ад трох грамадзян на вызваленне ад збору. Першапачаткова сельвыканкам разам з падатковай інспекцыяй пераглядзеў спіс і выключыў адтуль «мёртвых душ». Цяпер працуюць з тымі, каго могуць адшукаць праз знаёмых ці сваякоў.

Знайсці работу да 1 мая магчыма, калі ў людзей ёсць такое жаданне, лічыць **старшыня Цяцеркаўскага сельскага Савета дэпутатаў Браслаўскага раёна Павел АНТАНЁНАК.** У яго на тэрыторыі ва ўтрыманцы трапіла няшмат жыхароў, таму атрымліваецца працаваць індывідуальна. А ў Светласельскім сельсавеце Шумілінскага раёна ўсіх, у каго складаныя абставіны з пошукам работы, запрасілі на сход. **Старшыня Савета дэпутатаў Віктар ШЧАРБАКОЎ** высвятляў у кожнага, якія ў яго праблемы, ці трэба дапамагчы. Пошукам работы таксама займаецца і цэнтр занятасці. У хуткім часе ў сельсавеце правядуць кірмаш вакансій. З тымі, хто знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, працуе спецыяльная камісія, якая праводзіць праверку і вызваляе ад падатку, калі на тое ёсць падставы. На сезонныя работы набірае і сельвыканкам, і ЖКГ. Людзям прапануюць работу па добраўпарадкаванні населеных пунктаў, у лясгасе, на выпасе жывёл, на меліярацыі ці на нарыхтоўцы дроў.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# ЗАПЛАЦІЎ — І ГАЛАВА НЕ БАЛІЦЬ

## Як матываваць вяскоўцаў падпісваць дагаворы на вываз смецця

**Вываз адходаў на вёсцы — праблема не столькі тэхнічная, колькі... светапоглядная. Не ўсе гаспадары спяшаюцца заключыць адпаведныя дагаворы з камунальнымі службамі. І многія па-ранейшаму выкідваюць адходы ў неналежных месцах. Як пераканаць людзей змяніць стэрэатыпы паводзін? Адказ на пытанне мы пашукалі разам з работнікамі ЖКГ Докшыцкага раёна.**



Праблема смецця — пытанне не толькі камунальна-эканамічнае, але і сацыяльна-палітычнае. Гадоў дзесяць таму ў італьянскім Неапалі здарыліся масавыя выступленні абураных грамадзян. Прычынай таму сталі горы бытавых адходаў, што грувасціліся проста на вуліцах гарадоў. Праблема ў тым, што яго вываз, як і многія іншыя сферы, кантралюецца мафіяй. Час ад часу яна «прыбірала» кіраўнікоў фірмаў, якія гэта смецце перапрацоўвалі. І дапрыбіралася да таго, што ў пэўны момант вывозіць адходы ўжо не было каму. Хоць улада прыняла пэўныя захады, смеццевы крызіс дагэтуль не пераадолены цалкам.

У беларускай глыбінцы смеццевае пытанне таксама паўстае даволі востра, толькі з дакладнасцю наадварот. У канцы лютага на сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў было агучана, што толькі 43% уладальнікаў аднапавярховых дамоў у сельскай мясцовасці заключылі дагаворы на вываз. Інакш кажучы, камунальныя службы гатовыя вывозіць цвёрдыя бытавыя адходы (ТБА), але далёка не ўсе вясковыя жыхары бачаць у гэтым сэнс.

Вывозіць смецце з асобна ўзятай вёскі мэтазгодна тады, калі дагаворы падпішуць не менш за 60—70% хатніх гаспадарак. Інакш ганяць туды вялікі смеццявоз будзе эканамічна нявыгадна. Ці дорага каштуе вываз ТБА? Магчыма, людзі проста берагуць капейку? Бо эканомія ва ўсім — аб'ектыўная патрэба вясковага жыцця. «З аднаго чалавека мы бяром за гэту паслугу 1 рубель 26 капеек у месяц, — тлумачыць **намеснік дырэктара прадпрыемства «Докшыцы-камунальнік» Генадзь КАЛЬЧЫНСКІ.** — Калі ў доме жыве сям'я, то гэтая сума памнажаецца на колькасць яе членаў». Неват для вёскі лічба не выглядае непад'ёмнай. У чым жа тады прычына «байкатавання» дагавораў?

На думку кіраўніцтва прадпрыемства «Докшыцы-камунальнік», праблема ў асноўным светапоглядная. Вяскоўцы прывыклі проста спальваць смецце, закапваць або выкідваць куды-небудзь у яр або ў кусты. І мяняць звыклыя шаблоны паводзін не спяшаюцца. «Ды якое ж у нас смецце? — шчыра дзівяцца многія пажылыя вяскоўцы. — Няма чаго вывозіць!» І гэта даволі распаўсюджаны пункт гледжання. Аднак на двары не дзевятнаццатае стагоддзе і не пачатак дваццатага, калі адходы ад хатняй гаспадаркі былі пераважна арганічнымі. Таму вываз смецця — надзённая патрэба, хоць і не ўсімі ўсвядомленая.

Праўда, людзям ва ўзросце здароўе часта не дазваляе ехаць у райцэнтр, каб заключыць дагавор. Але Генадзь Кальчынскі запэўнівае, што праблем ніякіх няма: камунальнікі самі гатовы выехаць да спажыўца паслугі. «Вядома, гэта лішнія выдаткі, але мы ідзём на іх. Садзім некалькіх нашых супрацоўнікаў у «Газель», і яны едуць па вёсках з гатовымі бланкамі. Абы толькі людзі пагадзіліся падпісаць. І мы дасягнулі значнага прагрэсу. На дадзены момант ужо 88,3% гаспадарак дагаворы з намі заключылі. У гэтым сэнсе «ўзорна-паказальныя» — аграгарадок Параф'янава, Крыпульскі і Докшыцкі сельсаветы». Працуюць з гаспадарамі дамоў і на адлегласці: шлюць лісты з прапановай карыстацца паслугай цэнтралізаванага вывазу ТБА.

Як адбываецца збор смецця? Там, дзе ёсць магчымасць, прадпрыемства ўсталёўвае кантэйнерныя пляцоўкі. У іншых выпадках машына ў вызначаны час праязджае па вёсцы, і людзі выходзяць да яе з пакетамі і закідваюць смецце ў кантэйнер. Пажылым і нямоглым зрабіць гэта дапамагае кіроўца. Адначасова прадпрыемства займаецца ліквідацыяй стыхійных сметнікаў. Па словах кіраўніцтва, іх ужо бадай не засталося. Дарэчы, за выкідванне смецця ў неналежным месцы ўпаўнаважаныя спецыялісты маюць права скласці пратакол адміністрацыйнага правапарушэння. А гэта пагражае штрафамі. Але страх пакарання не павінен з'яўляцца галоўным матыватарам да заключэння дагавора на вываз ТБА. «Мы жывём у XXI стагоддзі, і парадак на зямлі, чысціня на вуліцах павінны быць эстэтычнай патрэбай кожнага чалавека, — кажа Генадзь Кальчынскі. — Гэта мы і тлумачым людзям. Зрэшты, жыхары раёна і самі паспелі ацаніць перавагі цэнтралізаванага вывазу смецця. Заплаціў невялікія грошы — і галава не баліць. Не трэба нічога спальваць і ні ад кога хавацца».

**Валянцін БОЙКА.**
*boika@yahoo.com*

# «Наша задача — падказваць і папярэджваць»



***(Заканчэнне. Пачатак на 1–й стар. «МС»)***

Між тым мабільная група на прадпрыемстве была зусім нядаўна — у пачатку года. Цяпер ажыццяўляецца паўторны кантроль, увага звяртаецца на тое, ці выпраўлены былыя хібы. Дарэчы, тады адбыліся сумныя факты выяўлення работнікаў у нецвярозым стане, спазненняў на працу. Гэтым разам такіх выпадкаў не ўбачылі.

Разам з Аляксандрам Ключынскім знаёмімся з рабочымі. Таццяне Пузінай летам будзе 55, а гэтаму прадпрыемству яна аддала 35 гадоў жыцця. Тут асвойвала прафесію і тут усё жыццё ўдасканальвалася. Сёння абслугоўвае 6 фрэзерных станкоў. Калі работы многа, можа і 9, і 12 абслугоўваць.

— Атрымліваю за сваю працу 300 рублёў на месяц. Заробак выдаюць своечасова. Хапае. Ежу я бяру з сабой. Ёсць у нас харчаблок з мікрахвалёўкай, халадзільнікам і чайнікам. Бытавыя ўмовы нармальныя. Зімой, калі былі маразы, у цэху ацяпленне ўключалі. І ў бытавых памяшканнях абагравальнік працаваў. Мне блізка да работы. Я тут у інтэрнаце жыву — 5 мінут хады, — кажа Таццяна.

11 гадоў аддаў заводу 50-гадовы токар паўаўтаматаў Міхаіл Фамін. Ён, як і калега, пенсіянер Віктар Лысянок, заробкам ад 450 да 500 рублёў таксама задаволены. Між тым рабочыя вакансіі на прадпрыемстве ёсць, і іх запаўняюць па неабходнасці, сцвярджае дырэктар прадпрыемства Аляксандр Ксяндзоў.

— Бяром рабочых пакрыху. Пяць станочнікаў нам патрэбна. А вось інжынерна-тэхнічных работнікаў не плануем браць. Пускавы рухавік мала дзе сёння прымяняецца. А тут у нас усё абсталяванне прызначана менавіта пад такую вытворчасць. Перарабіць яго пад выпуск нечага іншага нельга.

Пакуль гутарым з рабочымі і кіраўніцтвам, спецыялісты, што ўваходзяць у мабільную групу, разыходзяцца, і кожны звяртае ўвагу на профільныя «дробязі», якія ўрэшце гавораць аб арганізацыі працы на прадпрыемстве. Між тым начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама Аляксандр Ключынскі нагадвае, да чаго прыводзяць нядбайныя адносіны да правілаў бяспекі.

— У будаўніча-мантажным упраўленні «Гомельэнергабуд» у канцы мінулага года на людзей абрынулася цагляная сцяна — пры правядзенні работ па ўмацаванні падмурка будынка ў Васілевічах Рэчыцкага раёна. Два чалавекі — рабочыя Мазырскага ўчастка арганізацыі — загінулі. Гэта быў суботні дзень, і кантроль за працаўнікамі аслабілі. Аказалася, што работы яны праводзілі без спецыяльнага допуску, акрамя гэтага, адзін з загінулых быў нецвярозым. Майстар, які павінен кантраляваць працэс, у момант трагедыі адышоў. У яго крыві таксама пазней знайшлі алкаголь. У дачыненні да яго была ўзбуджана крымінальная справа, але ён не стаў чакаць фіналу расследавання і скончыў жыццё самагубствам... Вось так адсутнасць сістэмы кантролю прывяла да таго, што адразу тры сям'і пазбавіліся сваіх карміцеляў.

Увогуле ж летась на вытворчасці ў горадзе Гомелі загінулі шэсць чалавек. І таму, гавораць члены мабільнай групы, маніторынг праводзіць проста неабходна. Гарадская мабільная група пабывала ў мінулым годзе на 94 прадпрыемствах. Было выяўлена звыш трох тысяч разнастайных парушэнняў па ахове працы, працоўнай і вытворчай дысцыпліне, санітарным заканадаўстве і пажарнай бяспецы, мерах па захаванасці маёмасці.



Па выніках кожнага наведвання маніторынгавай групы кіраўнікі атрымлівалі спіс і прапановы спецыялістаў па ліквідацыі знойдзеных недахопаў. Там, дзе не патрабавалася фінансавых укладанняў, меры прымаліся практычна адразу. У іншых выпадках складалася дарожная карта з указаннем тэрмінаў выканання. Калі гэтыя тэрміны міналі, мабільная група наведвала прадпрыемства паўторна — і зноў нечакана.

Вось і на заводзе пускавых рухавікоў ёсць пэўныя змены ў лепшы бок, адзначае кіраўнік каманды кантралёраў.

— Каля 90% рэкамендацый, якія мы даём, выконваецца, — гаворыць Аляксандр Ключынскі. — Прадпісанні тым кіраўнікам, якія праштрафіліся, выдае пракуратура Гомеля, якая адсочвае кожны выезд мабільнай групы. На гэтым прадпрыемстве радуе тое, што ўсе людзі знаходзяцца на працоўных месцах і робяць сваю справу. Рабочыя пацвярджаюць, што сёння яны працуюць поўны працоўны дзень і своечасова атрымліваюць заробак. Людзі цэняць работу, якую маюць, і спадзяюцца, што будзе лепш. Увогуле, мэта работы нашай мабільнай групы — не караць, а падказваць.

Тым часам пры падвядзенні вынікаў работы мабільнай групы на заводзе пускавых рухавікоў высвятляецца, што недахопы ўсё ж знойдзены. І кожны са спецыялістаў іх агучвае па гарачых слядах. (Праз некалькі дзён гэты спіс ужо будзе надрукаваны на аркушах.) Так, памочнік урача-гігіеніста Гомельскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Жанна Цімашкова звяртае ўвагу на стан бытавых памяшканняў.

— Сантэхніка ў санвузлах старая. Металічныя трубаправоды іржавыя. Там трэба правесці рамонтныя работы, бо такая сітуацыя прыводзіць да грыбковых захворванняў. Трэба як мага хутчэй прывесці ўсё ў парадак.

Галоўны спецыяліст Гомельскай гаррайінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Вольга Савянок звяртае ўвагу на непрыбраную тэрыторыю і пляцоўку, дзе размяшчаюцца кантэйнеры. Акрамя таго, знаходзіць парушэнне ў вядзенні першаснага ўліку падземных вод, якія дабываюцца.

Прадстаўнікі энерганагляду і МНС заўважаюць, што энергаслужба прадпрыемства не ўкамплектавана электратэхнічным персаналам, не выкананы касметычны рамонт электрапамяшканняў, часткова не зачынены на замкі сілавыя шафы, не заземлены станкі, не праводзіліся заняткі для персаналу па эвакуацыі з будынкаў і навучанне па пажарна-тэхнічным мінімуме... Таксама высвятляецца, што да правядзення агнявых работ допушчаны асобы, якія не маюць пры сабе пасведчання пра прысваенне кваліфікацыйнага разраду па прафесіі... Частка рабочых працавалі без прадугледжаных сродкаў індывідуальнай засцярогі органаў слыху і спецвопраткі. Асобная заўвага — наконт адзення супрацоўніка, які займаецца зварачнымі работамі без спецыяльнай вопраткі.

Дарэчы, не заўсёды справа абмяжоўваецца толькі рэкамендацыямі. Так, летась да адказнасці былі прыцягнуты 310 чалавек, у тым ліку пяць кіраўнікоў. І таму спецыялісты мабільнай групы гавораць напрыканцы:

— Мы яшчэ вернемся да вас...

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

**Старшыня Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў Іван БАРАДЗІНЧЫК:**

*— Практычна ў кожным выездзе мабільных груп пастаянна ўдзельнічаюць дэпутаты гарадскога Савета. Гэта вельмі важная і карысная форма работы, перш за ўсё накіраваная на азнаямленне з канкрэтным прадпрыемствам рэальнага сектара эканомікі або аб'ектам сацыяльнай сферы, культуры, спорту і гэтак далей. Вельмі важна не толькі пабываць на прадпрыемстве, але і даведацца, чым дыхае калектыў, як уладкаваны працоўныя месцы, як наладжаны бытавыя ўмовы.*

*У Гомелі кіраўнікі прадпрыемстваў прывыклі да таго, што яны пастаянна «пад прыцэлам». Асаблівая ўвага ўдзяляецца кантролю арганізацыі аховы працы. Гэта ж нашы людзі, за якіх мы нясём адказнасць. Калі здараецца так, што кіраўніцтва прадпрыемства неналежным чынам выконвае калектыўны дагавор, не вырашае пэўныя бытавыя або сацыяльныя пытанні, не клапоціцца пра дысцыпліну, парадак, ахову працы, папярэджванне траўматызма, — вядома, мы рэагуем і ўносім свае прапановы. Пасля гэтага сітуацыя звычайна выпраўляецца.*

# Дом пад знос

## Як выконваецца Указ №100?

**Лёзненскі раён лічыцца адным з найлепшых па выкананні ўказа Прэзідэнта наконт зносу старога жылля і збудаванняў, якія не эксплуатуюцца. А ў Лёзненскі сельвыканкам па вопыт прыязджаюць нават з іншых рэгіёнаў і абласцей.**

— Для фарміравання рэгістра такіх будынкаў праводзім абследаванне тэрыторыі кожнага населенага пункта — іх усяго 42. Сумесна з дэпутатамі і старэйшынамі складаем акт абследавання домаўладанняў і зямельных участкаў, потым звяртаемся ў раённую камісію, — расказвае **старшыня Лёзненскага сельскага Савета Святлана ПУКАВА.**

Пасля абследавання дома і складання заключэння раённай камісіяй у трохдзённы тэрмін накіроўваецца апавяшчэнне ўласніку аб запланаваным уключэнні жылога дома ў рэгістр. Тут, як правіла, бываюць цяжкасці з пошукам уласнікаў і нашчадкаў. Паколькі многія з іх, забраўшы бацькоў да сябе па месцы жыхарства, забываюць аб тым, што за ўчасткам і домам неабходны догляд. А ўспамінаюць пра гэта толькі тады, калі атрымліваюць лісты з раённай камісіі. Да пошукаў спадчыннікаў далучаюцца старэйшыны, нават суседзі.

— А пры неабходнасці афармляем запыт у РАУС аб аказанні дапамогі. У двухмесячны тэрмін (з даты складання заключэння) райвыканкамам прымаецца рашэнне аб уключэнні дома ў рэгістр. На падставе выпіскі з яго і заключэння райвыканкама не пазней чым праз месяц з дня ўключэння жылля ў рэгістр падаецца заява ў суд, — працягвае суразмоўніца.

Пры гэтым прыкладаецца мноства дакументаў. Сярод іх: копія акта абследавання зямельнага ўчастка і размешчанага на ім домаўладання, фота домаўладання і зямельнага ўчастка. У «папцы» і копія заключэння раённай камісіі, звесткі, прадстаўленыя бюро па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, копія асабовага рахунка з пагаспадарчай кнігі, інфармацыя інспекцыі па падатках і зборах...

Робіцца і копія раённай газеты, у якой надрукаваны адпаведныя звесткі. Плюс выпіска з прадстаўніцтва Белдзяржстраха аб наяўнасці дагавораў добраахвотнага страхавання, звесткі з натарыяльнай канторы, копія рашэння аб уключэнні ў рэгістр.

— Пасля прыняцця рашэння судом сумесна з раённай камісіяй вызначаем далейшы лёс пустога дома, перададзенага ў камунальную ўласнасць раёна, — канстатуе Святлана Пукава.

Толькі за апошнія два гады на тэрыторыі Лёзненскага сельсавета шляхам адкрытых таргоў прадалі пяць дамоў. Іх агульны кошт да дэнамінацыі перавышаў 55,6 мільёна рублёў. На канец сакавіка былі прызначаныя таргі па чарговым домаўладанні. Рыхтуюцца матэрыялы па продажы яшчэ двух...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# З ЧЫМ ІДУЦЬ ДА ДЭПУТАТА?

**Не так даўно змяніўся склад Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Дэпутаты паспелі папрацаваць у акругах, глыбей пазнаёміцца з праблемамі, што цікавяць іх выбаршчыкаў. Сваімі ўражаннямі ад першых месяцаў работы ў галіне заканатворчасці падзяліліся некаторыя з абраных прадстаўнікоў.**



**Валерый КУРСЕВІЧ, член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па мінскай Аўтазаводскай акрузе №92**, сам некалі працаваў на машынабудаўнічым прадпрыемстве, так што праблемы рабочых у яго былі на слыху.

— Першыя тыдні ці не на кожнай сустрэчы людзі цікавіліся, калі іх жыллё паставяць у чаргу на рамонт, як хутка будуць выкананы работы. Прыходзілі скаргі і на недастатковасць паслуг, і на іх якасць. Мы з прадстаўнікамі раённых улад гэтыя пытанні спрабуем вырашаць: робім праверкі, стараемся, каб дом, што патрабуе рамонту, быў пастаўлены ў чаргу. У нашай акрузе ёсць жыллё 50-х гадоў пабудовы. Зразумела, умовы там не адпавядаюць сучаснаму разуменню камфорту, па тую ж ваду жыхарам даводзіцца хадзіць да калонкі ў двары. Так што неабходна было вызначыцца з памерамі аплаты некаторых камунальных паслуг, наогул удакладніць лёс жыльцоў і будынкаў.

Што датычыцца іншых пытанняў, то, мяркую, з імі сутыкнуліся многія дэпутаты незалежна ад акругі. Напрыклад, моладзь цяпер асабліва цікавіць Дэкрэт №3. На маю думку, трэба як мага паўней інфармаваць людзей па любых новых законах. Разуменне таго, што адбываецца, не дае прасторы для чутак і адразу змяншае «напал» у грамадстве. Напрыклад, пры выездзе на прадпрыемства стараюся дэтальна адказваць на пытанні рабочых, гаварыць з людзьмі, нават калі тыя прыпыняюць на вуліцы.



**Людміла МАКАРЫНА-КІБАК, старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па мінскай Грушаўскай акрузе №99**, адзначыла, што першыя месяцы па працы аказаліся напружанымі: у гэтай частцы Маскоўскага раёна горада шмат новабудоўляў.

— Стараюся працаваць індывідуальна з кожным зваротам. Новабудоўлі — гэта не толькі пытанні па атрыманні кватэры. Людзям хочацца, каб побач з домам была адладжаная інфраструктура: пабудаваныя школы, дзіцячыя садкі, паліклінікі... У нас даволі добра ходзіць грамадскі транспарт, побач — лінія метро, але наколькі зручна перамяшчацца па акрузе людзям з абмежаванымі магчымасцямі? Такое пытанне задаў адзін з выбаршчыкаў, і мы разам з камісіяй правяралі безбар'ернасць асяроддзя. Наогул, па любым пытанні да мяне можна звярнуцца падчас прыёму, але людзі ведаюць, што я працую ўрачом і, бывае, заязджаюць у бальніцу не толькі з медыцынскім клопатам. Часам чалавек не зусім разумее, якім чынам даць справе ход, ён спадзяецца, што дэпутат павінен адразу вырашыць праблему, хаця для гэтага дастаткова было б звярнуцца да патрэбнага прадстаўніка выканаўчай улады.

Сёння жыццё вельмі дынамічнае і праблемы, якія даводзіцца разглядаць, часам выходзяць за межы акругі, лічыць



**Алена АНІСІМ, член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Стаўбцоўскай акрузе №70.**

Асноўныя пытанні, з якімі прыходзяць выбаршчыкі, датычацца водазабеспячэння і якасці дарожнага пакрыцця. У сельскай мясцовасці гэта асабліва актуальна, бо часта замест асфальту вуліца ўяўляе сабой брукаваную ці проста грунтовую дарогу.

— Цяпер ідзе газіфікацыя, рабочыя кладуць трубы і не заўсёды прыводзяць вуліцы ў першапачатковы выгляд. У такіх выпадках многія абураюцца дарожным зборам, бо не бачаць вынікаў гэтых выплат. Падобныя сітуацыі стараюся вырашаць праз раённую ўладу. Мяркую, што сёння трэба асабліва падтрымліваць і развіваць мясцовыя органы кіравання. Сельскія Саветы дэпутатаў пры пэўнай актыўнасці маглі б аператыўней паведамляць пра недахопы ў раён і кантраляваць якасць пэўнага віду работ — той жа дарожнай службы на месцах.

Наогул, дэпутат займаецца даволі вялікім спектрам спраў — ад крыўдаў на судовыя рашэнні да пошуку памяшкання пад краязнаўчы музей. Вострым пытаннем застаецца пабудова чыгуначнага прыпынку каля адной з вёсачак на Стаўбцоўшчыне. Па словах Алены Анісім, такі аб'ект не толькі палепшыў бы транспартнае забеспячэнне, але і зрабіў бы мясцовасць больш прывабнай для моладзі.

— Дэпутат павінен глядзець на праблему не толькі з пазіцыі ўласнай акругі. Сёння запатрабаваны аналітычны падыход, каб на аснове асобных фактаў вымалёўваць агульную сітуацыю. А каб ведаць розныя аспекты жыцця ў краіне, трэба абменьвацца назіраннямі і раіцца з калегамі.



**Вольга ПАПКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Навагрудскай акрузе №57**, упэўнена, што ў рэгіёны неабходна прыцягваць інвестыцыі і наладжваць там эфектыўную вытворчасць.

— Безумоўна, гэта не так проста. Але стварэнне перспектыўных прадпрыемстваў сельскай мясцовасці не толькі забяспечыць работнікаў працоўнымі месцамі і заробкам, але і дасць сродкі ў мясцовы бюджэт праз падаткі.

Па словах дэпутата, многа зваротаў у першыя месяцы паступіла наконт паслуг ЖКГ, афармлення дакументаў на новае жыллё. Скардзіліся выбаршчыкі і на высокія расцэнкі ў мясцовай лазні. Асабліва складаным аказалася пытанне жылля для ўдоў ветэранаў-афганцаў. На жаль, пакуль што дапамагчы па гэтай праблеме не атрымалася: трэба ўносіць змены ў заканадаўства.

— Часам да мяне паступаюць рацыяналізатарскія прапановы ад выбаршчыкаў. Іх нямнога, але я вельмі ў іх зацікаўлена. Напрыклад, адна з іх звязана з лясной гаспадаркай. Для мяне гэта новая тэма, таму з усіх бакоў стараюся падысці да вырашэння такога пытання. На маю працу дэпутата ўплывае і папярэдні вопыт работы ў сферы культуры, бо часта людзі звяртаюцца з прапановамі па развіцці і захоўванні гісторыка-культурных, мастацкіх здабыткаў. Часам атрымліваю звароты не толькі ад выбаршчыкаў акругі, але і ад грамадзян з іншых рэгіёнаў нашай краіны. Змена заканадаўства — не такі хуткі працэс, як, магчыма, думаюць некаторыя, але я ўжо выбрала кірункі заканатворчай ініцыятывы, па якіх буду працаваць. У першую чаргу мяркую прапанаваць шэраг паправак у Кодэкс аб культуры.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*


**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС** на 31 декабря 2016 года

| | |
|---|---|
| Организация | ОАО «Новое стекло» |
| Учетный номер плательщика | 101180535 |
| Вид экономической деятельности | заготовка вторичного вырья |
| Организационно-правовая форма | акционерная |
| Орган управления | Мингорисполком |
| Единица измерения | тыс. руб. |
| Адрес | 220035, г. Минск, ул. Тимирязева 67, офис 1317 |

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 33 | 33 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **33** | **33** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 6 | 2 |
| в том числе: материалы | 211 | 2 | 2 |
| готовая продукция и товары | 214 | 4 | – |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 4 | 5 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 2 | – |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **12** | **7** |
| **БАЛАНС** | **300** | **45** | **40** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 4 | 4 |
| Добавочный капитал | 450 | 18 | 17 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (7) | (14) |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **15** | **7** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | – | 2 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 30 | 31 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 19 | 26 |
| по авансам полученным | 632 | 4 | – |
| по налогам и сборам | 633 | 5 | 3 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 | 1 |
| по оплате труда | 635 | 1 | – |
| прочим кредиторам | 638 | – | 1 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **30** | **33** |
| **БАЛАНС** | **700** | **45** | **40** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ** за январь – декабрь 2016 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2016 г. | За январь – декабрь 2015 г. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 195 | 194 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (49) | (49) |
| Валовая прибыль | 030 | 146 | 145 |
| Расходы на реализацию | 050 | (137) | (130) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 9 | 15 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 4 | 12 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (4) | (19) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 9 | 8 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 9 | 8 |
| Налог на прибыль | 160 | (2) | (3) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 7 | 5 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 1 | 1 |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | 8 | 6 |

Руководитель С.В. Варвашеня
Главный бухгалтер С.Н. Варвашеня

**Годовой отчет эмитента ценных бумаг за 2016 год ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс»**

Адрес: 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49, тел./факс 44 11 92, УНН 400078768.

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС** на 31 декабря 2016 года *тыс. руб.*

| Активы | Код строки | На 31.12.2016 г. | На 31.12.2015 г. |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 4379 | 4568 |
| Нематериальные активы | 120 | 13 | 3 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 4 | 6 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 76 | 76 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | | 20 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **4472** | **4673** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 3783 | 3056 |
| В т.ч. материалы | 211 | 2341 | 2241 |
| незавершенное производство | 213 | 78 | 84 |
| готовая продукция и товары | 214 | 1364 | 731 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 5 | 10 |
| Налог на добавленную стоимость | 240 | 7 | 4 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 4470 | 3799 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | 40 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1622 | 1573 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **9887** | **8482** |
| **БАЛАНС** | **300** | **14359** | **13155** |

| Собственный капитал и обязательства | Код строки | На 31.12.2016 г. | На 31.12.2015 г. |
|---|---|---|---|
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 3511 | 3908 |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | | 12 |
